## Першы абласны орхускі цэнтр у Беларусі з'явіцца ў Гродна.



Абласны Орхускі цэнтр будзе створаны ў Гродне ў межах рэалізацыі праекта ЕС і Праграмы развіцця ААН «Спрыянне развіццю структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь».

Мэта цэнтра — забеспячэнне доступу насельніцтва да экалагічнай інфармацыі, прававое кансультаванне ды інфармаванне людзей пра Орхускую канвенцыю, а таксама ўцягванне грамадскасці ў працэс прыняцця экалагічна значных рашэнняў на рэгіянальным узроўні.

Месца стварэння першага беларускага абласнога Орхускага цэнтра было вызначана ў снежні 2011 года па выніках конкурсу, у якім узялі ўдзел Гродзенскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Пятра Машэрава, Віцебскае дзяржаўнае абласное прадпрыемства па арганізацыі пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі і рэспубліканскі заказнік «Прыбужскае палессе». Пераможцу сярод прэтэндэнтаў выбіралі супрацоўнікі Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя разам з міжнароднымі экспертамі праекта ЕС/ПРААН. Асаблівая ўвага надавалася матэрыяльна-тэхнічнай базе, дзейнасці заяўнікаў для рэалізацыі вызначаных праграмай мэтаў, магчымасцям міжнароднага супрацоўніцтва, а таксама здольнасці функцыянаваць пасля сканчэння тэрміну рэалізацыі праекта. Гродзенскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя быў прызнаны пераможцам конкурсу, бо ён мае вялікі досвед узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі адукацыі ў экалагічнай сферы.

У выпадку паспяховасці функцыянавання першага абласнога Орхускага цэнтра плануецца распаўсюдзіць гэты досвед на Брэсцкую і Віцебскую вобласці.

**Источник:** Евробюллютень.-2012.-№ 8.-С.9.